МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

ФАКУЛЬТЕТ ЭКОНОМИКИ И ПРАВА

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ — 2011

## МАТЕРИАЛЫ VII МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

19-20 мая 2011 г.
г. Барановичи
Республика Беларусь

В 2 частях
Часть 2

Репозиторий БарГУ

Барановичи
РИО БарГУ
2011

УДК 001
ББК 72
С57

Рекомендовано к печати научно-методическим советом учреждения образования «Барановичский государственный университет»

Рецензенты:

*Г. Я. Житкевич,* кандидат экономических наук, доцент, первый проректор учреждения образования «Барановичский государственный университет»
*Е. Р. Медведева,* кандидат педагогических наук, доцентГорловского государственного педагогического университета иностранных языков (Украина)

Редакционная коллегия:

*А. В. Никишова* (гл. ред.), *И. Я. Тучина* (отв. ред.), *С. И. Бибик, Н. А. Егорова, А. В. Земоглядчук, В. Н. Зуев, Ю. К. Калугин, В. И. Козел, А. В. Литвинский, О. И. Наранович, Е. И. Платоненко, Т. М. Пучинская, Е. Я. Рутман, Л. И. Станиславчик, Д. А. Ционенко*

Репозиторий БарГУ

С57 **Содружество наук. Барановичи-2011** [Текст] : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, 19-20 мая 2011 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь : в 2 ч. / редкол. : А. В. Никишова (гл. ред.), И. Я. Тучина (отв. ред.) [и др.] — Барановичи : РИО БарГУ, 2010. — Ч. 2. — 303 с. — 170 экз.

ISBN 978-985-498-432-2
ISBN 978-985-498-434-6 (Часть 2)

Освещаются актуальные проблемы инженерной науки, экономики, права, экологии, психолого-педагогических и филологических наук. Рассматриваются теоретико-методологические аспекты обучения, его организационно-управленческие вопросы и др. Сборник содержит материалы, отражающие результаты теоретических и практических исследований, проведенных в вузах разного профиля Республики Беларусь и за рубежом.

Издание представляет интерес для широкого круга специалистов сферы образования, аспирантов и студентов.

УДК 001
ББК 72

© Коллектив авторов, 2011
© БарГУ, 2011

ISBN 978-985-498-432-2
ISBN 978-985-498-434-6 (Часть 2)

## 9. ФИЛОЛОГИЧЕКИЕ НАУКИ

**Криштоп И. С.** Мотив пути в лирике Э. Миллей и К. Буйло . . . 173
**Ломовская О. А.** Метафорический перифраз в произведениях писателей серебряного века . . . 174
**Марчик М. Е.** Антонимические конструкции в ранних сатирических рассказах М. Зощенко . . . 176
**Сегіневіч Дз. І.** Жанравая спецыфіка навел Г. Марчука «Давыд - Гарадоцкія каноны» . . . 177
**Селезнёва Т. А.** Модель развития межкультурной компетенции студентов-лингвистов на основе кодифицированных лингвострановедческих реалий . . . 178
**Архіпава Н. К.** Словаўтваральнае значэнне і словаўтваральная катэгорыя (на матэрыяле адсубстантыўных найменняў асобы) . . . 180
**Будзько А. А.** Эмацыянальна-экспрэсіўная лексіка ў паэме Якуба Коласа «Новая Зямля» . . . 181
**Грышчэня Т. Г.** Погляды на выклічнік як асобы лексіка-граматычны клас слоў . . . 183
**Дубоўская Т. А.** Паэзія Алеся Замкоўскага: гармонія думкі і пачуцця . . . 184
**Жуковіч С. В.** Стылістычная роля аднасастаўных сказаў у паэтычных творах А. Разанава . . . 185
**Кажэнава Т. С.** Лексікалогія як раздзел моваведства ў сучасным навуковым асвятленні . . . 187
**Каранеўская А. М.** «Гаваркое імя» ў загалоўках апавяданняў Л. Калюгі . . . 188
**Коршун Г. Ю.** Сувязь мінулага і сучаснасці ў творах А. Адамовіча і Г. Бёля . . . 189
**Лабэцкая І. Л.** Лексіка ўласнарускага паходжання ў сучаснай беларускай мове . . . 191
**Навіцкая Т. Л.** Структурныя асаблівасці побытавай лексікі ў гаворках Віцебшчыны . . . 192
**Санкевіч М. А.** Семантыка-дэфініцыйныя асаблівасці назоўнікаў са значэннем «галаўныя ўборы» . . . 194
**Талкун К. Ф.** Праблема чалавечага шчасця ў творчасці Максіма Танка і Аркадзя Куляшова . . . 195
**Чуносава І. С.** Жанравая адметнасць кнігі Янкі Сіпакова «Веча славянскіх балад» . . . 196
**Шагун Т. М.** Паходжанне саматычных фразеалагізмаў беларускай мовы . . . 198
**Гаврилюк М. П.** Internet Slang: Morphological Aspect . . . 199

## 10. ЛИНГВИСТИКА

**Авласенко С. В.** Репрезентация концепта «семья» в английской фразеологии . . . 201
**Азарчук А. В.** Признаки категории «собирательности» в современном русском языке . . . 202
**Александрова Ю. Г.** Соматическое пространство в японской языковой картине мира . . . 203
**Артмеладзе Н. Т.** Семантические особенности неологизмов современной английской рекламной коммуникации . . . 205
**Ашкина А. Н.** Лексико-грамматические средства выражения модальности предположения в текстах научного стиля (на примере немецкого языка) . . . 206
**Белюга М. А.** Лексико-грамматические средства выражения социальной субординации в японской прессе . . . 207
**Борисюк Е. В.** Семантический аспект гендер-фразеологизмов . . . 209
**Гнатюк Е. Ю.** Стилистические маркеры номинации социального статуса как стратификационные переменные . . . 210
**Евграфов А. А.** Подходы к изучению концепта преступление на материале французского языка . . . 212
**Ермолович А. В.** Синонимический ряд как актуальное средство семантико-деривационного развития лексемы «кризис» . . . 214
**Жуковская О. А.** Речевые тактики и языковые средства реализации прагматики политического дискурса . . . 215
**Казанчян А. В.** К вопросу о чэнъюй . . . 217
**Калинина Д. А.** Парадигма «домашние животные» в английском и русском языках . . . 217
**Козеева А. А.** Аббревиация в текстах научного стиля (на материале немецкого языка) . . . 219
**Колесникович Е. В.** Лингвистический анализ англоязычных названий музыкальных групп . . . 220
**Кудинович А. А.** Семантические особенности фразеологических единиц с именами собственными (на материале английского и русского языков) . . . 221
**Кудрицкая В. Ю.** К вопросу о вариативности стратегий и тактик вежливости в межличностном конфликте . . . 223
**Линкевич Ю. А.** Англицизмы в лексической системе японского языка . . . 224
**Лойко Е. П.** Социальная дифференциация «критики»: гендерный аспект . . . 226
**Муха А. А.** Языковые средства презентации родного края на иностранном языке . . . 227
**Мухина О. И.** Аспекты возникновения и вербализации эмоций в романе Амели Нотомб «Страх и трепет» . . . 228
**Наумик Н. С.** Средства выражения прагматической функции аргументации в англоязычных научных текстах . . . 230
**Павлович К. Л.** Способы лексикографического описания семантики адъективных слов (на материале английского и русского языков) . . . 231
**Плескацевич Т. А.** «Приветствие» в американской языковой культуре: гендерный аспект . . . 232
**Полевая Т. Н.** Об одной причине действенности метафор как средства имплицитного выражения оценки в публицистическом дискурсе . . . 233
**Полуянович Н. В.** Структурно-семантические особенности имен собственных в субстандарте (на материале английского и русского языков) . . . 235
**Прокопенко К. С.** Сравнительная характеристика языковой актуализации концепта любовь во французской национальной и индивидуально- авторской концептосфере Амели Нотомб (на примере романа «Ртуть») . . . 237
**Пушина А. А.** Перцептивный образ лексико-семантической группы «продукты питания» . . . 238
**Рыбак Е. В.** Экфрасис в романе Трейси Шевалье «Девушка с жемчужной сережкой» . . . 240
**Севец И. В.** Функционирование фразеологических единиц в языке массмедиа . . . 242
**Сидоренко М. А.** Метафора в субстандарте (на материале зооморфизмов английского и русского сленга) . . . 243
**Сирисько В. В.** Специфика оценочного компонента в соматических фразеологизмах . . . 245
**Станкевич Е. В.** Роль перцептивной метафоры в современной англоязычной рекламе . . . 246
**Тарабрина В. Ю.** Структурная характеристика фразеологизмов-соматизмов . . . 247
**Тимощенко А. Н.** К вопросу о понимании комической перлокуции англоязычных рекламных текстов носителями белорусского/русского языков . . . 249
**Цзянь Гэн** О парадигматических отношениях в системе обозначений неопределенного количества в русском и китайском языках . . . 250
**Шапель Ю. О.** Гендерная репрезентация видов невербальной коммуникации в тексте (на примере современных американских романов) . . . 251
**Чарнышова А. М.** Структурная характарыстыка моўных адзінак са значэннем візуальнага кантакту на матэрыяле аповесцей В. Быкава . . . 253

Репозиторий БарГУ

Верш «Спакойнага шчасця не зычу нікому…» — тонкі і складаны лірычны твор. Багатыя, ёмістыя сваёй асацыятыўнасцю і абагульненасцю вобразы, вытокам якіх паслужыла вусна-паэтычная творчасць, даюць вельмі багаты матэрыял для роздуму над прызначэннем чалавека, над сэнсам яго жыцця. Галоўная думка твора — чалавек павінен быць актыўным, нястомным, неспакойным, упартым і, нарэшце, чалавечным. Такая ідэя выяўляецца шляхам выключнага лаканізму, экспрэсіўнасці, афарыстычнасці мовы. Рытарычнае пытанне «навошта?» надае знітаванасць разнастайным вобразам-асацыяцыям, якія выяўляюць глыбокую філасофскую думку, паэтычны наказ сучаснікам [4, с. 53–54].

Такім чынам, можна сказаць, што Максім Танк і Аркадзь Куляшоў, знайшлі адказ на пытанне, што такое шчасце, яны дапамагаюць і сваім чытачам зразумець яго сэнс. Паэты заклікаюць быць актыўнымі, нястомнымі ў жыццёвых пошуках і памкненнях, бачыць радасць кожнага дня, святло паўсядзённых рэчаў і з'яў.

**Спіс крыніц**


1. *Бельскі, А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе : вучэб. дапам. / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005. — 352 с.
2. *Бугаёў, Д.* Паэзія Максіма Танка / Д. Бугаёў. — Мінск : Беларус. навука, 2003. — 311 с.
3. *Бярозкін, Р.* Аркадзь Куляшоў. Нарыс жыцця і творчасці. / Р. Бярозкін. — Мінск : Нар. асвета, 1978. — 192 с.
4. *Міцкевіч, У. А.* Аркадзь Куляшоў у школе / У. А. Міцкевіч. — Мінск ; Нар. асвета, 1979. — 80 с.
5. *Мішчанчук, М. І.* Беларуская літаратура на сучасным этапе : літаратурна-крытычныя артыкулы / М. І. Мішчанчук. — Мінск : Выш. школа, 1978. — 144 с.



***І. С. Чуносава***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь


## ЖАНРАВАЯ АДМЕТНАСЦЬ КНІГІ ЯНКІ СІПАКОВА «ВЕЧА СЛАВЯНСКІХ БАЛАД»

Жанравая спецыфіка літаратуры цікавіць даследчыкаў яшчэ з часоў Арыстоцеля. Пытанні жанравай тыпалогіі, «жанравага мыслення» (А. Андрэеў) даследаваліся ў навуковых працах Я. Барычэўскага, М. Бахціна, В. Бялінскага, А. Весялоўскага, М. Гарэцкага, У. Гніламёдава, М. Мішчанчука, М. Палякова, Г. Паспелава, В. Рагойшы і інш.

Мэта дадзенай работы — вызначыць праяўленне тыповых і індывідуальна-аўтарскіх прымет літаратурнага жанру ў кнізе Я. Сіпакова «Веча славянскіх балад» (1973, 1988) і патлумачыць, якія крытэрыі абумоўліваюць жанравую дыферэнцыяцыю мастацкіх твораў.

Галоўнай прыметай літаратурнага жанру можа выступаць «прыналежнасць да таго ці іншага роду». У сваю чаргу, кожны літаратурны род характарызуецца адметнай арганізацыяй маўлення (вершаванай або празаічнай), наяўнасцю традыцыйнага пафасу і сюжэта [2, с. 288]. У «Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў» падкрэсліваецца, што «ў аснове кожнага жанру ляжыць больш або менш пэўны змест, характар адлюстравання гэтага зместу, асаблівасці кампазіцыі, архітэктонікі» [4, с. 58]. Жанравую асаблівасць мастацкага твора абумоўлівае, на думку М. Мішчанчука, і пастаўленая пісьменнікам задача — «паказаць з'явы і факты, < … > выхаваць, навучыць чытача нечаму, звярнуць увагу на недахопы, з хваляваннем перажыць убачанае і заклікаць да такога перажывання іншых, < …> раскрыць філасофскі змест таго, што апынулася ў полі зроку» [5, с. 165].

Як ужо адзначалася, адна з самых важных жанравых прымет — прыналежнасць да таго ці іншага літаратурнага роду. Балада — твор ліра-эпічны, таму перш за ўсё трэба гаварыць пра жанр, дзе адбываецца злучэнне адзінства эпічнага і лірычнага. Гэту асаблівасць падкрэсліваў Я. Барычэўскі: «Яе [балады] галоўная асаблівасць — у зусім арыгінальных адносінах апавядальніка да свайго сюжэта… Аўтар балады, як эпічны паэт, апісвае нейкія жыццёвыя падзеі, але ён перажывае іх як лірык. Два пачаткі — апавядальны і лірычны — арганічна зліты ў баладзе» [5, с. 116].

Эпічнасць кнігі «Веча славянскіх балад» праяўляецца ў маштабнасці ахопу падзей. «Гэта спроба стварэння манументальнага беларускага эпасу…» [3, с. 682]. Але, магчыма, не толькі ўласнабеларускага, а агульнаславянскага. Шляхам рэтраспекцыі аўтар узнаўляе гісторыю славян з сярэдзіны XX стагоддзя да праславянскіх часоў, у баладах раскрываюцца многія лёсавызначальныя факты жыцця славянскіх плямёнаў і народаў: венедаў, антаў, дулебаў, чэхаў, македонцаў, чарнагорцаў, палякаў, балгар, сербаў, беларусаў. Другая сусветная вайна, Сялянскае паўстанне 1863—1864 гадоў, узнікненне кнігадрукавання, татара-мангольская навала, Грунвальдская бітва, узнікненне славянскай пісьменнасці, хрышчэнне Русі — вось далёка не поўны пералік гістарычных падзей, якія адлюстроўваюцца ў зборніку. Кожная з балад можа ўспрымацца як асобны мастацкі твор, а ўсе яны, аб'яднаныя ў адну кнігу, дазваляюць стварыць цэласнае эпічнае літаратурнае палатно.

Героі Я. Сіпакова — звычайныя людзі (прадстаўнікі народа) і рэальныя гістарычныя асобы (Я. Гус, К. Каліноўскі, М. Капернік, Ф. Скарына, браты Кірыла і Мяфодзій). У ідэалізаванай форме аўтар услаўляе гераічныя паводзіны людзей, якія абараняюць гонар, незалежнасць свайго народа ці смела адстойваюць сваю грамадзянскую пазіцыю: К. Каліноўскі гіне «за вольную волю і вольны народ», Ф. Скарына рызыкуе дзеля

Репозиторий БарГУ

сваёй друкарскай справы, М. Капернік не адмаўляецца ад свайго адкрыцця і гарыць у інквізітарскім кастры. Катэгарычна непрымальны аўтар да здрады і здраднікаў, вобразы якіх неаднаразова асуджаюцца ў баладах («Падман», «Еш!», «Званні», «Пыл»):

*Яшчэ не дагарэлі*
*Вогненныя дзіды,*
*Якімі Батый спаліў Кіеў,*
*І пыл яшчэ асядае на пажарышча,*
*Як гарачы попел...*
*А ўжо знайшоўся баян,*
*Які пырхаючы ад пылу, спявае: —*
*Слава, слава, слава Батыю!*
*І дзякуе, дзякуе «вызваліцелям»*
*За нагрэты ў запыленых бурдзюках*
*Ханскі кумыс...*
*А можа,*
*Пырхаецца яму не толькі ад пылу?* [7, с. 169].

Сюжэтная лінія балад Я. Сіпакова абумоўлена тыповай для гэтага жанру тэматыкай. У мастацкай літаратуры «балада — драматычна напружаны, сюжэтны ліра-эпічны верш казачна-фантастычнага, легендарна-гістарычнага ці гераічнага зместу» [6, с. 417]. Адметна, што Я. Сіпакоў паглыбляе жанравую тэматыку: ён імкнецца аднавіць гісторыю ўзнікнення першых славян ад моманту з'яўлення «навароднага чалавека». Гэта яднае балады Сіпакова з анталагічнымі жанрамі (прытчай, жыціем, містэрыяй), «дзе чалавек суадносіцца не столькі з жыццём грамадства, колькі з касмічнымі пачаткамі, універсальнымі законамі светапарадку і вышэйшымі сіламі быцця» [8, с. 209]. Дадзеная асаблівасць можа тлумачыцца як праяўленне ўзаемасувязі з народнай баладай, у якой нярэдка адлюстроўваюцца міфалагічныя ўяўленні, а таксама як імкненне да аналогіі з біблейскім сюжэтам пра з'яўленне Сусвету і першых людзей.

Лірычная плынь твораў раскрываецца праз аўтарскую эмацыянальнасць і адметную выразнасць маўлення. Прысутнасць аўтара-апавядальніка адчуваецца ў кожнай баладзе: Я. Сіпакоў не толькі расказвае пра розныя гістарычныя падзеі, канстатуе факты, але і асэнсоўвае іх, робіць вывады, перадае ўласныя адносіны. Аўтарская пазіцыя часам выяўляецца ў афарыстычных выслоўях, якія служаць сродкам перадачы ідэйнага зместу твораў. Афарыстычнасць мыслення — адна з прымет стылістычнай манеры Я. Сіпакова. Афарызмы з'яўляюцца сродкам выражэння ацэначных меркаванняў, станоўчых і адмоўных вывадаў, абагульненняў, філасофскіх роздумаў: *«Хто праўду пасее, той волю пажне»* («Шыбеніца»), *«Крылаў няма ў чалавека, каб падмінаць імі неба»* («Крылы»), *«Можна паліць і святое, калі нам загад ёсць на тое»* («Кантрабанда»).

Жанравая спецыфіка абумоўлівае адбор і арганізацыю моўных сродкаў у мастацкім творы. Для балад характэрна злучэнне індывідуальна-аўтарскага і народна-фальклорнага мыслення. Тыповая для гэтага жанру фальклорная паэтыка выяўляецца ў выкарыстанні традыцыйных вобразаў (*зязюлькі-гаротніцы, змяі-чараўніцы, бядняцкага шчасця*), ва ўжыванні сталых эпітэтаў і эпітэтаў-прыдаткаў *(свет далёкі, край нязнаны, лісце-дукаты, зелле-гарэліца, няверніці-каты)*, адухаўленні прыродных з'яў (*«Што ж ты, дзень мой, канчаешся хутка, — // Дай хоць промні твае расчасаць»* [7, с. 139]; *«Схіліліся адна да адной травінкі — сцішыліся і чакаюць. // Схіліліся featуранакаляровымі галоўкамі краскі — замоўклі, затаілі дыханне і чакаюць»* [7, с. 257]). Звяртаецца аўтар і да беларускай міфалогіі, у творы ўводзяцца вобразы беларускіх багоў Перуна і Вялеса. Балады набываюць гучанне народнай песні, падання, легенды («Птушка», «Змяя», «Багі»).

У сваёй кнізе Я. Сіпакоў пашырае жанравыя межы балады. «У творчасці гэтага аўтара баладны жанр набыў сінтэтычную прыроду, паколькі спалучае ў сабе прыметы лірыкі, эпасу і драмы», — адзначае А. І. Бельскі [1, с. 185–186]. Адлюстраванне дзеяння і характараў праз дыялагічнае маўленне персанажаў, уласцівае драме, сустракаем у баладах «Званы», «Чараўніца», «Веча», «Цар», «Вадаспад», «Лапці». Драматычны пачатак праяўляецца ў рознай ступені: ад увядзення дыялагічнага маўлення ў літаратурны твор да балад, якія цалкам складаюцца толькі з рэплік персанажаў.

У кнізе Я. Сіпакова «Веча славянскіх балад» выяўляюцца многія традыцыйныя рысы гэтага жанру: напружаны сюжэт, гераічны пафас, выразна акрэсленая аўтарская пазіцыя, зварот да міфалогіі і фальклорнай паэтыкі. Разам з тым, кніга мае сваю адметнасць, якая выяўляецца ў імкненні аўтара да творчага пошуку і пашырэння жанравых межаў.

## Спіс крыніц


1. *Бельскі, А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: Класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005. — 352 с.
2. Введение в литературоведение / Г. Н. Поспелов [и др.] ; под ред. Г. Н. Поспелова, 2-е изд. — М. : Высш. школа, 1983. — 327 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / Нац. Акад. навук Беларусі. — Мінск : Беларус. навука, 2003. — Т. 4 Кн. 2 : 1986 — 2000 ; пад рэд. У. В. Гніламёдава. — 2003. — 975 с.
4. *Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапам. для наст. / М. А. Лазарук, А. Л. Ленсу. — Мінск : Народная асвета, 1983. — 191 с.
5. *Мішчанчук, М. І.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: Хрэстаматыя : вучэбн. дапаможн. / аўт.-склад. М. І. Мішчанчук, М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск : УП «ІВЦ Мінфіна», 2004. — 364 с.
6. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
7. *Сіпакоў, Я.* Веча славянскіх балад / Я. Сіпакоў. — 2-е выд., дап. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. — 263 с.
8. *Хализев, В. Е.* Теория литературы: учебник для студентов вузов / В. Е. Хализев. — М. : Высш. школа, 1999. — 240 с.